Андрэй Адамовіч



...Мне бракуе вострых суворых формаў,
Каб адарвацца ад сваіх думак...

# Заўтрашні дзень

### Мара

Я хацеў бы жыць на высьпе,
Невялікай, але каб трымалася моцна
У водах поўначы.
Толькі каменьне. Няма пяску.
І вецер дзён трыста ў год.

Мора б ільдом не закрывалася,
Але паром прыходзіў бы рэдка.
Раз на сто дзён і тое
Толькі на паўгадзіны.
Па-за сьвядомасьцю Terra.

Тут жыў бы маленькі, але годны народ.
Са сваім каралём.
Старым алкаголікам.
Без запалак, люлек і тытуню.

Мова была б свая ні на што не падобная.
Зусім бяз зычных, ці толькі з іх.
І бяз слоўнікаў і нормаў,
Што запісаны ў кнігі.
З турыстамі размаўлялі б мы
Па-ангельску, але вельмі рэдка.
Вецер з дзяцінства тут
Вучыў бы людзей маўчаць.
Таму кожны разьлічваў бы на сябе,
І ў выніку перамог.
Я працаваў бы ў бібліятэцы.
Шмат пылу і думак спачылых людзей.
Самы дасьведчаны чалавек на высьпе,
І, можа быць, самы разумны.
З паромам прыходзіла б новая партыя кніг,
Я іх чытаў бы тры тыдні,
Пасьля б перачытваў
Што-небудзь старое.
Тут неба было б у аблоках і дождж,
І брак ліхтароў на вуліцах,
Затое шмат птушак, мне невядомых,
Якія прыкольна крычаць,
І ўсё разумеюць.

Тыднямі я сядзеў бы не беразе ў крэсьле
І глядзеў, да прыкладу, на аблокі,
Якія ляцелі б, скажам, на поўдзень,
І разумеў бы, што так далёка мне не патрапіць.
Вечарамі аб’язджаў бы я выспу
На ровары. Меў бы скамечанае паліто,
Заламаны налева бярэт
(Правая частка твару хварэла б часьцей,
Але і жыла б весялей.)
Адзіную мару б у сэрцы я гнезьдзіў:
Зьезьдзіць у Лондан, каб у Таўэры да мяне
Крумкач падкульгаў і сказаў голасам
чалавечым:
«А мы ўжо і не чакалі...»

Адну ноч на тыдзень
Я праводзіў бы ў сваім ложку,
У астатні час спаў бы між кнігаў
Між імі б і сілкаваўся.
Я ня ўсоўваў бы нос свой
У справы чужых людзей.
Бо ім нельга дапамагчы,
Нават, калі яны просяць.
Успамін пра цябе я б адкладваў
Аж да самых сьвятых Калядаў,

Да Вялікдня ці да Дзядоў…
Шкода толькі — ня помню сноў,
Напэўна яны твае.
Але мне і гэтага дастаткова.
Дастаткова гэтага мне.

**У чаканьні элегіі**

Калі я прачынаюся на сьвітаньні,
Мне не хапае часу на тое,
Каб даведацца, хто перамог.
Калі я падпальваю сваю першую цыгарэту,
Мне бракуе паветра на тое,
Каб зайсьціся ў кашлі.
Калі я п’ю першы ранішні кубак кавы,
Дык не кладу цукру,
Бо калоцяцца мае рукі.

Але не істотна гэта.
Але.
Але.
Але не істотна.

Калі ўдзень я скошаным полем іду,
Мне не хапае асфальту,
Каб пабачыць, як варыцца паветра.
Калі я гляджу на аблокі,
Мне бракуе вострых суворых формаў,
Каб адарвацца ад сваіх думак.
Калі я стаю пры дрэве,
Дык чакаю калькіх кропляў дажджу,
Бо мне сумна ў адзіноце.

Але не істотна гэта.
Але.
Але.
Але не істотна.

Калі я адчуваю пальцы ветру на скуры,
Мне не хапае пачуцьця гумару,
Каб Барэю прамовіць энцыкліку.
Калі я хапаю сонца за валасы,
Мне бракуе хуткасьці ў думках,
Каб заплесьці салярныя тэксты.
Калі я заходжу ў ваду прыўкраснага возера,
Дык не плаваю доўга,
Бо зацягваць нешта не мае сэнсу.

Але не істотна гэта.
Але.
Але.

Але не істотна.

Калі я саджуся за стол,
Мне не хапае ўпартасці,
Каб з’есці абед цалкам.
Калі вяскоўцы збіраюць сена,
Мне бракуе словаў, каб апісаць,
Як конь у зубох трымае сухую траву.
Калі я слухаю сябра,
Дык гляджу яму ў вочы,
Бо думкі мае далёка.

Але не істотна гэта.
Але.
Але.
Але не істотна.

Калі я бяру ў рукі кнігу,
Мне не хапае ўвагі на тое,
Каб зразумець, што папера і туш – літаратура.
Калі я забіваю камара на сваёй шыі,
Мне бракуе літасьці на тое,
Каб не размазаць яго ад вуха да падбароддзя.
Калі я бачу, як дзяўчынкі ідуць паўз возера,
Дык адварочваюся хутка,
Бо не жадаю быць сьмешным.

Але не істотна гэта.
Але.
Але.
Але не істотна.

Калі я бяру ў руку асадку,
Мне не хапае волі,
Каб да нататніка дацягнуцца.
Калі я бачу, як сонца сядае на захадзе,
Мне бракуе фантазіі і натхненьня,
Каб уявіць, што зранку яно зьявіцца на ўсходзе.
Калі зіхацець пачынае першая зорка,
Дык я падпальваю дваццатую цыгарэту,
Бо прыемна быць падобным да Дэміурга.

Але не істотна гэта.
Але.
Але.
Але не істотна.

Калі я засынаю ў ложку,
Мне не хапае тваіх уздрыгваньняў,
Каб адчуць вастрыню быцьця.
Але.